# НОВАЯ ЛІТАРАТУРА АБ СЯРЭДНЯВЕЧНАЙ БЕЛАРУСІ:

Гісторыя сялянства Беларусі. Ад старажытнасці да 1861 г. – Т. 1. – Мн., 1997. – 431 с.: Іл.

*Э.М.Загарульскі.* Заходняя Русь. IX–XIII стст.: Вучэбны дапаможнік. – Мн., 1998. – 240 с.: Іл.

Першае з адзначаных выданняў – калектыўная абагульняючая манаграфія, прысвечаная аграрнай гісторыі беларускіх зямель ад пачатку сярэднявечча да адмены прыгоннага права. Гэты том – першы з трохтомнай працы. Ён падрыхтаваны вялікім аўтарскім калектывам, складзеным з вядучых беларускіх вучоных. На падставе шырокай гісторыяграфічнай і крынічнай базы разгледжаны працэсы складання і развіцця сялянства, яго гаспадаркі, формаў землекарыстання і землеўладання, дынаміка адносін з пануючым саслоўем, сацыяльныя рухі і канфлікты ў вёсцы, а таксама культура і духоўны свет сялян.

Кніга пабудавана па традыцыйнаму храналагічнаму прынцыпу і пачынаецца з раздзела аб сялянстве ў VI–XIII стст. Першыя стагоддзі адзначанага часу (VI–VIII стст.) разглядаюцца як эпоха станаўлення сялянства ў працэсе разлажэння першабытнага ладу. Даецца кароткі агляд стану гаспадаркі і сацыяльных адносін усходнеславянскага насельніцтва. Падкрэсліваецца агульнасць працэсаў, што адбываліся на ўсёй тэрыторыі прыдняпроўскіх славян. Адзначаецца пераход да суседскай абшчыны, які аўтары адносяць да мяжы VIII–IX стст. Аднак недахоп мясцовых крыніц не дазволіў разглядаць гэты працэс у нашых землях падрабязней. IX–XIII стст. адзначаны як час станаўлення феадальных парадкаў і пачатку стварэння залежнага сялянства.

Другі раздзел прысвечаны эпосе Вялікага княства Літоўскага (XIV–сярэдзіна XVII ст.). Падрабязна аналізуецца запрыгоньванне сялян. Іх павіннасці, аграрная палітыка ўлад; разглядаюцца сацыяльныя канфлікты, асабліва значныя напрыканцы XIV – сярэдзіны XVII ст.

У трэцім і чацвёртым раздзелах апавядаецца гісторыя сялянства з сярэдзіны XVII ст. да далучэння беларускіх зямель да Расіі ў канцы XVIII ст. Пяты раздзел прысвечаны жыццю сялянства  падчас крызісу феадальна-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

прыгонніцкай сістэмы (да сярэдзіны XIX ст.). На заканчэнне тома, у шостым раздзеле, разглядаюцца пытанні побыта сялян і іх мірапоглядаў.

Змест тома ўвогуле добра ілюструе сучасны стан беларускай аграрнай медыявістыкі і лакуны ў нашых ведах, якія тычацца перш-наперш эпохі станаўлення сялянства і ягонай арганізацыі – абшчыны. Трэба, аднак, зазначыць, што ён напісаны ў традыцыйным для савецкай гістарыяграфіі напрамку: недастае ўвагі разгляду штодзённага жыцця сялян у розныя часіны вялізнай эпохі ў паўтары тысячы гадоў, разглядаемай у томе. Амаль па-за рамкамі манаграфіі засталіся пытанні складання спецыфічнай сялянскай мянтальнасці, тое, што ў сучаснай медыявістыцы прыцягвае ўвагу многіх даследчыкаў. Пажадана было часцей звяртацца да параўнаўчых дадзеных з суседніх зямель, што дазволіла б лепш зразумець месца Беларусі ў гісторыі.

У цэлым жа, перад намі першае ў айчыннай гістарыяграфіі спецыяльнае абагульняючае выданне аб аграрным развіцці Беларусі; і таму кніга мае вялікую каштоўнасць як для спецыялістаў і студэнтаў, так і для шырокага кола зацікаўленых гісторыяй чытачоў.

Другая з адзначаных манаграфій – вучэбны дапаможнік Э.М.Загарульскага аб станаўленні сярэднявечнага грамадства на Беларусі і ахоплівае першыя 500 год яе гісторыі. Напісана кніга вядомым навукоўцам, адным са старэйшых беларускіх археолагаў. Яна носіць праблемны характар, аўтар не пазбягае дыскусійных пытанняў, падрабязна аналізуе існуючыя пункты гледжання, аргументуе свае погляды, адзначае нявырашаныя пытанні.

Пачынае аўтар з праблем утварэння сярэднявечнага насельніцтва беларускіх зямель (глава 1). Ён падрабязна прасочвае этнагенетычныя працэсы і, лічу, абгрунтавана даказвае спецыфіку ўтварэння і старажытнарускай народнасці, і выдзялення з ёй у працэсе асіміляцыі мясцовага балцкага насельніцтва ўсходнімі славянамі продкаў беларусаў.

Адзначаючы неабходнасць большай увагі да палітычнай гісторыі, у главах 2–3 аўтар падрабязна разглядае станаўленне і развіццё дзяржаўнасці на нашых землях і робіць гэта на шырокім усходнееўрапейскім фоне. У главе 3 аўтар таксама аналізуе асноўныя палітычныя структуры і феадальныя інстытуты.

Чацвёртая глава прысвечана разгляду гаспадарчага ладу. Даследчык падрабязна раскрывае эвалюцыю паляводства і агракультуры, больш сціпла – іншыя бакі сялянскага жыцця. На жаль, аўтар не выкарыстаў матэрыялы аб тапаграфіі і забудове вясковых паселішчаў. Гэта зрабіла б характарыстыку вясковага жыцця больш выразнай. Затое вельмі падрабязна аўтар разглядае праблему ўзнікнення гарадоў. Сказаўся, напэўна, ягоны даўні інтарэс да сярэднявечнай урбаністыкі. Лічу вельмі слушнымі як разважанні аўтара, так і ягоны вывад аб з'яўленні сапраўдных гарадоў толькі з XII ст. Падрабязна, хаця і карацей, апісана забудова і гаспадарка гарадоў.

Асобная, 5-я глава, прысвечана культуры. Асноўная ўвага ў ёй удзелена архітэктуры, як у цэлым, так і яе найбольш значным помнікам.

Заканчваецца манаграфія звяртаннем да аналізу этнічных працэсаў, з якіх аўтар пачынае працу. Такі падыход у кантэксце ўсяго твора выглядае лагічным, бо этнагенетычныя пытанні цяпер найбольш дыскусійныя. Пазіцыя Э.М.Загарульскага, які адстойвае існаванне агульнай, усходнеславянскай, старажытнарускай народнасці, выглядае, як адзначалася, досыць абгрунтаванай, асабліва археалагічнымі і моўнымі данымі. Але не магу пагадзіцца з паўторанымі некалькі разоў сцвярджэннямі аб адсутнасці адрозненняў паміж так званымі летапіснымі плямёнамі. Думка аўтара, што крывічы, радзімічы, дрыгавічы і іншыя стварыліся падчас асіміляцыі славянамі розных па культуры

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

балцкіх утварэнняў, мае рацыю. Але ж і ў старажытнарускі час тыя ж радзімічы адрозніваліся, як вядома, ад суседзяў падборам жаночых упрыгожванняў. Тое ж датычыць крывічоў і іншых. Як археолагу, аўтару гэта добра вядома.

На заканчэнне яшчэ раз не стрымаюся ад зазначэння аб удалым стылі выкладання, абраным аўтарам: свабодныя разважанні з павагай да апанентаў, з засяроджаннем увагі чытачоў на нявырашаных пытаннях, з карэктным, як бы мовіць, інтэлігентным адстойваннем асабістых меркаванняў. У выніку чытач (перш-наперш студэнт, але і не толькі ён) мае магчымасць выпрацаваць і свой пункт гледжання. Сказаўся шматгадовы выкладчыцкі вопыт у БДУ.

Мяркую, абодва выданні зоймуць дастойнае месца на кніжных паліцах і адыграюць сваю ролю ў вывучэнні нашай гісторыі.

***Я.Р.РЫЕР,***
***доктар гістарычных навук,***
***прафесар.***

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова